**ФЛОР І ЛАЎР**, святыя, што ўшаноўваліся ў народзе як заступнікі коней. У іх гонар 31 жніўня (н.ст.) адзначалася т.зв. Конскае свята, у царкве служылі малебны. У гэты дзень на конях не працавалі, іх не запрагалі, не путалі. Жанчыны пяклі праснакі, меншыя за чайныя сподачкі, якія называлі «капытамі». Здаралася, што разам з забаронай араць на конях забаранялася жанчынам ткаць. У асобных вёсках Ф. і Л. лічыўся прысвяткам пастухоў.

*Літ.*: Васілевіч У.А. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ